Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"
(ВДУ імя П.М. Машэрава)

УДК 811.161.3'27(476)(047.3)
№ дзяржрэгістрацыі 20111545
Інв. № ______________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
ВДУ імя П.М. Машэрава

____________ І.М. Прышчэпа
"    "            2015 г.

СПРАВАЗДАЧА
АБ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОЦЕ

# АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ І РЭГІЯНАЛЬНЫЯ МОЎНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў КАМУНІКАТЫЎНАЙ ПРАСТОРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**у рамках заданні**
**«Этнапрастранства беларускіх рэгіёнаў у мове і культуры: мінулае і сучаснасць»**

ДПНД "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава", заданне 4.1.13
2011 – 2015 гг.

(заключная)

Навуковы кіраўнік НДР,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт ________________ Г.А. Арцямёнак

Начальнік навукова-даследчага сектара,
кандыдат геолага-мінералагічных навук,
дацэнт ________________ І.А. Красоўская

Віцебск 2015

СПІС ВЫКАНАЎЦАЎ


Навуковы кіраўнік тэмы:
канд. філал. навук, дацэнт ____________________ Г.А. Арцямёнак (уводзіны, раздзел 1, заключэнне)

Выканаўцы тэмы:
канд. філал. навук, дацэнт ________________________ А.С. Дзядова (раздзел 2)

канд. філал. навук, дацэнт ________________________ Ю.М. Бабіч (раздзел 3)

канд. філал. навук, дацэнт ________________________ В.І. Несцяровіч (раздзел 4)

канд. філал. навук, дацэнт ________________________ Г.К. Семянькова (раздзел 5)

канд. філал. навук, дацэнт ________________________ В.Э. Зіманскі (раздзел 6)

канд. пед. навук, дацэнт ________________________ С.В. Мартынкевіч (раздзел 7)

выкладчык ________________________ А.А. Калеснікава (раздзел 8)

аспірант ________________________ К.С. Півавар (раздзел 9)

нормакантралёр ________________________ Т.В. Харкевіч

## РЭФЕРАТ

Справаздача 116 старонак, 1 ч., 50 крыніц, 1 дадат.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА, КАМУНІКАТЫЎНАЯ ПРАСТОРА, ДЫЯЛЕКТНАЯ ЛЕКСІКАГРАФІЯ, РЭГІЯНАЛЬНЫ СЛОЎНІК, НЕКАДЫФІКАВАНАЯ ЛЕКСІКА, КІТАБІСТЫКА, МОЎНАЯ АСОБА, МЕНТАЛЬНАСЦЬ, ВЕРБАЛІЗАЦЫЯ КАНЦЭПТАЎ

Аб’ект даследавання – агульнанацыянальныя і рэгіянальныя моўныя працэсы на камунікатыўнай прасторы Беларусі ў гісторыі і сучаснасці.

Мэта працы – вызначэнне ўдзельнай вагі і аптымальных суадносін састаўных кампанентаў моўнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь; выпрацоўка аргументаваных рэкамендацый у сферы моўнай палітыкі і моўнай экалогіі. Асноўныя задачы: 1) па магчымасці поўная слоўнікавая фіксацыя і сістэматызацыя сучаснай рэгіянальнай лексікі Віцебшчыны, 2) выяўленне характэрных асаблівасцей і галоўных тэндэнцый развіцця беларускамоўнага мастацкага і публіцыстычнага дыскурсу рэгіёна, 3) акрэсленне камунікатыўнай прасторы асноўных ідыёмаў і магчымых шляхоў карэкціроўкі іх функцыянальных межаў, 4) выяўленне спецыфікі ўзаемадзеяння агульнанародных і рэгіянальных фактараў у гісторыі і актуальнай камунікацыі дастасоўна да беларускай мовы, 5) паказ спецыфікі беларускай мовы як сродку міжкультурнага ўзаемадзеяння (на матэрыяле кітабаў), 6) вызначэнне сродкаў вербалізацыі ключавых сацыяльных паняццяў і канцэптаў беларускамоўнага дыскурсу, 7) устанаўленне лінгвадыдактычнай значнасці і рэлевантных для навучання мове параметраў асноўных моўных ідыёмаў на тэрыторыі Беларусі.

Метады даследавання – апісальна-аналітычны, сацыялінгвістычны, таксанамічны, супастаўляльны, статыстычны.

У выніку выканання задання выдадзены “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны”, зроблены семантыка-стылістычны аналіз зафіксаванай у ім лексікі, устаноўлены яе прадметна-тэматычныя і функцыянальныя разрады, кагнітыўны і лінгвакультурны патэнцыял, паходжанне і сферы ўжывання.

Актуальнасць вынікаў выканання задання тлумачыцца неабходнасцю захавання для будучых пакаленняў беларускай мовы ва ўсёй сукупнасці форм яе існавання. Неабходна таксама зафіксаваць усё багацце сучаснага народнага маўлення, прааналізаваць працэсы, якія ў ім адбываюцца і напрамкі, па якіх яно эвалюцыянуе. Гэта дазваляе выявіць заканамернасці і характар развіцця моўнай сітуацыі ў далейшым, магчымасці свядомага ўплыву на яе суб’ектаў моўнай палітыкі.

Навуковую навізну вынікаў даследавання вызначае ў першую чаргу выданне ўнікальнага сучаснага даведніка “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны” ў 2 частках і рознабаковы аналіз сабранага ў ім фактычнага матэрыялу. У слоўніку знайшла адлюстраванне як

традыцыйная народная лексіка, так і інавацыі апошняга часу, абумоўленыя зменамі ў грамадскім жыцці. Створаны слоўнік можа служыць крыніцай моўных фактаў для ўстанаўлення шляхоў развіцця і магчымасці захавання традыцыйных беларускіх дыялектаў.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў дзейнасці дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый пры планаванні і ажыццяўленні нацыянальна-моўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Канкрэтныя высновы прымяняюцца ў школьным і ўніверсітэцкім навучанні пры чытанні лекцый, правядзенні практычных заняткаў, у працэсе кіраўніцтва напісаннем магістарскіх дысертацый, навуковых, дыпломных і курсавых прац, вучэбнай і вытворчай практыкай студэнтаў. “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны” запатрабаваны ў рабоце аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, прымяняецца ў навуковай працы настаўнікамі і вучнямі устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Віцебскай вобласці. У ВНУ, гімназіях і сярэдніх школах краіны выкарыстоўваюцца 22 вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, у тым ліку 7, выдадзеных з грыфам Міністэрства адукацыі РБ.

ЗМЕСТ

Уводзіны …………………………………………………………………………………… 6
Асноўная частка …………………………………………………………………………... 10
1 “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны” ў кантэксце беларускай дыялектнай лексікаграфіі …………………………………………………………......................................... 10
2 Семантыка моўнага знака ў гаворках Віцебшчыны ………………….............. 14
3 Некадыфікаваная лексіка ў публіцыстычным тэксце …………………………… 25
4 Лексічныя і сінтаксічныя асаблівасці Кітаба А. Хасяневіча (1832) ……………. 34
5 Неафіцыйны анамастыкон Падзвіння: семантыка-структурны аспект ……….. 46
6 Функцыянаванне лексічных адзінак і сінтаксічных канструкцый у дзелавых і рэлігійных помніках старабеларускага пісьменства ……….…………………………… 53
7 Методыка фарміравання базавых маўленча-камунікатыўных уменняў моўнай асобы на фоне сучаснай моўнай сітуацыі ……………………………………………….. 65
8 Вербалізацыя ключавых сацыяльных паняццяў у беларускамоўным дыскурсе.. 77
9 Спецыфіка моўнай рэпрэзентацыі ключавых канцэптаў пісьменнікамі Віцебшчыны ў агульнанацыянальным кантэксце ………………………………………. 89
Заключэнне ………………………………………………………………………………... 102
Спіс выкарыстаных крыніц ……………………………………………………………. 108
Дадатак А. Асноўная бібліяграфія ……………………………………………………….. 112

# УВОДЗІНЫ

Беларуская мова з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў самаідэнтыфікацыі і этнічнай кансалідацыі беларускага народа, часткай і сродкам стварэння яго духоўнай культуры. Сёння беларуская мова – дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь, тытульная мова беларускага этнасу, галоўны інструмент стварэння духоўных каштоўнасцей беларусаў. Сацыяльна-гістарычная практыка пераканаўча сведчыць, што мова кожнага народа – гэта не толькі камунікатыўна-знакавая сістэма, але і істотны фактар нацыянальнага самавызначэння, кампанент духоўнага быцця. Беларуская літаратурная мова гістарычна фарміравалася і працягвае развівацца на грунце народных гаворак, жывіцца імі, таму ў наш час неабходна зафіксаваць усё багацце беларускіх дыялектаў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, устанавіць тэндэнцыі і напрамкі, згодна з якімі яны эвалюцыянуюць.

У беларускай камунікатыўнай прасторы здаўна выкарыстоўваліся розныя мовы ў іх тэрытарыяльных і сацыяльных разнавіднасцях, якія знаходзіліся ў цесным перапляценні і актыўным узаемадзеянні паміж сабой. Беларускую мову як спрадвечную мову беларускага этнасу, скарбніцу нацыянальнай культуры неабходна зберагчы для будучых пакаленняў. Для гэтага ў сучасных умовах неабходна выразна акрэсліць найбольш прымальныя сферы яе выкарыстання, месца ў адносінах да рускай мовы і дыялектаў.

Навукова-даследчая тэма "Агульнанацыянальныя і рэгіянальныя моўныя працэсы ў камунікатыўнай прасторы Рэспублікі Беларусь: гісторыя і сучаснасць" у межах задання "Этнапрастора беларускіх рэгіёнаў у мове і культуры: мінулае і сучаснасць", № дзяржаўнай рэгістрацыі 20111545 ад 17.06.2011 г., выконвалася на працягу 2011 – 2015 гадоў. Прадугледжвалася выяўленне спецыфікі і заканамернасцей узаемадзеяння агульнанацыянальных і рэгіянальных моўных працэсаў у камунікатыўнай прасторы Рэспублікі Беларусь; вызначэнне найбольш прымальных сфер паўнацэннага выкарыстання беларускай мовы ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму; выпрацоўка абгрунтаваных рэкамендацый для суб'ектаў моўнай палітыкі (дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый) і сферы адукацыі; стварэнне сучаснага "Рэгіянальнага слоўніка Віцебшчыны"; устанаўленне шляхоў развіцця і магчымасцей захавання традыцыйных беларускіх дыялектаў, іх ролі ў функцыянаванні сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

У межах тэмы для больш поўнага яе раскрыцця разглядаўся таксама шэраг прыватных праблем і пытанняў: выяўленне рэгіянальнай спецыфікі мовы сродкаў масавай інфармацыі і пісьменнікаў Віцебшчыны, акрэсленне тэматычнай дыферэнцыяцыі дыялектнай лексікі рэгіёна, вызначэнне складу і функцый неафіцыйнага антрапанімікону Падзвіння, мадэляванне сацыяльна значных канцэптаў у моўнай карціне свету беларусаў, аналіз семантыкі дыялектных намінацый, устанаўленне асноўных параметраў і лінгвадыдактычнай

значнасці кампанентаў рэгіянальнай моўнай прасторы, распрацоўка методыкі фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў. Планавалася падрыхтоўка манаграфій, прысвечаных адлюстраванню вобраза чалавека ў фразеалогіі і парэміялогіі, а таксама ключавым канцэптам беларускай ментальнасці, выданне разнастайных вучэбна-метадычных дапаможнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы.

Сутнасць задання заключалася ў вызначэнні ўдзельнай вагі і аптымальных суадносін састаўных кампанентаў сучаснай моўнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь (беларуская і руская літаратурныя мовы, тэрытарыяльныя дыялекты, паўдыялекты, мясцовыя гаворкі), што можа паслужыць асновай для аргументаваных рэкамендацый у галіне моўнай палітыкі і моўнай экалогіі. Як адна з асноўных мэт прадугледжвалася па магчымасці поўная слоўнікавая фіксацыя і сістэматызацыя сучаснай рэгіянальнай лексікі Віцебшчыны. Задачамі даследавання з'яўляліся выяўленне характэрных асаблівасцей і галоўных тэндэнцый развіцця беларускамоўнага мастацкага і публіцыстычнага дыскурсу рэгіёна; акрэсленне камунікатыўнай прасторы асноўных ідыёмаў і магчымых шляхоў карэкціроўкі іх функцыянальных межаў; выяўленне спецыфікі ўзаемадзеяння агульнанародных і рэгіянальных фактараў у гісторыі і актуальнай камунікацыі дастасоўна да беларускай мовы; устанаўленне лінгвадыдактычнай значнасці і рэлевантных для навучання мове параметраў асноўных моўных ідыёмаў на тэрыторыі Беларусі.

Праведзеныя даследаванні былі накіраваны на распрацоўку комплекснага аналізу духоўна-культурнага патэнцыялу беларускай мовы, вызначэнне яе камунікатыўнай нішы ў сучасным грамадстве з мэтай падрыхтоўкі аргументаваных рэкамендацый для дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх органаў у галіне моўнай палітыкі і моўнай экалогіі. Упершыню ў айчыннай лінгвістыцы апублікаваны і шырока выкарыстоўваецца ў навуковых даследаваннях "Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны", прааналізаваны моўныя і культуралагічныя асаблівасці рэгіянальных лексем Падзвіння, распрацавана праблема лінгваментальнасці, дадзена тэарэтычнае асэнсаванне корпуса некадыфікаванай лексікі, вызначаны рэлевантныя паказчыкі камунікатыўнай кампетэнцыі беларускамоўнай асобы ў сітуацыі білінгвізму. Дыялектная лексіка, збор і лексікаграфічная апрацоўка якой з'яўляецца адной з задач навуковых росшукаў, адлюстроўвае жыццё, побыт, менталітэт жыхароў Віцебшчыны ў мінулым і на сучасным этапе, а таксама паказвае некаторыя шляхі і тэндэнцыі развіцця літаратурнай мовы.

Выкананае заданне поўнасцю адпавядае зацверджаным мэтам падпраграмы "Беларуская мова і літаратура" дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава" і аднаму з прыярытэтных напрамкаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2011 – 2015 гады,

зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.04.2010 № 585, а менавіта: 11. Сацыяльна-эканамічнае і духоўна-культурнае развіццё Рэспублікі Беларусь. 11.9. Гістарычнае развіццё беларускай мовы, яе сучасны стан, функцыянаванне і сувязі з іншымі мовамі свету.

Актуальнасць вынікаў выканання задання тлумачыцца тым, што беларуская мова як спрадвечны сродак зносін беларускага этнасу, скарбніца нацыянальнай культуры павінна быць захавана для будучых пакаленняў ва ўсёй сукупнасці форм яе існавання. Для гэтага патрэбна выразна вызначыць найбольш прымальныя сферы яе выкарыстання ва ўмовах білінгвізму, месца ў камунікацыі адносна рускай мовы і дыялектаў. Неабходна таксама зафіксаваць усё багацце сучаснага народнага маўлення, прааналізаваць працэсы, якія ў ім адбываюцца і напрамкі, па якіх яно эвалюцыянуе. Гэта дазваляе даць адказ на шэраг актуальных пытанняў, звязаных з духоўным развіццём грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, а таксама выявіць заканамернасці і характар развіцця моўнай сітуацыі ў далейшым, магчымасці свядомага ўплыву на яе суб’ектаў моўнай палітыкі.

Навуковую навізну вынікаў даследавання вызначае ў першую чаргу выданне ўнікальнага сучаснага даведніка “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны” ў 2 частках і рознабаковы аналіз сабранага ў ім фактычнага матэрыялу. У слоўніку знайшла адлюстраванне як традыцыйная народная лексіка, так і інавацыі апошняга часу, абумоўленыя зменамі ў грамадскім жыцці. На моўным матэрыяле канкрэтнага рэгіёна паказаны зрухі ў структуры камунікатыўнай прасторы, вызначаны іх прычыны і наступствы, дадзена ацэнка моўнай сітуацыі ў краіне. Створаны слоўнік можа служыць крыніцай моўных фактаў для ўстанаўлення шляхоў развіцця і магчымасці захавання традыцыйных беларускіх дыялектаў, вызначэння іх ролі для функцыянавання сучаснай беларускай літаратурнай мовы. На гэтай падставе выяўлены спецыфіка і заканамернасці ўзаемадзеяння агульнанацыянальных і рэгіянальных моўных працэсаў у краіне, вызначаны сферы паўнацэннага выкарыстання беларускай мовы, устаноўлены рэлевантныя для сучаснасці рысы беларускага менталітэту.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў дзейнасці дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый пры планаванні і ажыццяўленні нацыянальна-моўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Канкрэтныя высновы прымяняюцца ў школьным і ўніверсітэцкім навучанні пры чытанні лекцый, правядзенні практычных і семінарскіх заняткаў, у працэсе кіраўніцтва напісаннем магістарскіх дысертацый, навуковых, дыпломных і курсавых прац, вучэбнай і вытворчай практыкай студэнтаў. У вучэбным працэсе рэалізуюцца распрацаваныя падчас выканання задання інавацыйныя формы арганізацыі самастойнай працы студэнтаў і школьнікаў пры вывучэнні беларусазнаўчых дысцыплін.